Весці БДПУ. Серыя 2. 2017. № 4. С. 73–78.

УДК 930:94(476)(1-21)"8/12"

# АЦЭНКА ПОГЛЯДАЎ БЕЛАРУСКІХ ГІСТОРЫКАЎ НА ПРАБЛЕМУ ПАХОДЖАННЯ ГАРАДОЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ IX–XIII стст.

**Ю. У. Врублеўскі,**
*кандыдат гістарычных навук, загадчык кафедры сацыяльнай работы БДПУ*

Паступіў у рэдакцыю 31.10.17.

UDC 930:94(476)(1-21)"8/12"

# ASSESSMENT OF THE VIEWS OF BELARUSIAN HISTORIANS ON THE PROBLEM OF THE ORIGIN OF CITIES ON THE TERRITORY OF BELARUS IN THE 9TH-13TH CENTURIES

**Y. Vrubleuski,**
*Candidate of Historical Science*
*Head of the Chair of Social Work of BSPU*

Received on 31.10.17.

Даследуюцца тэарэтычныя і канцэптуальныя асновы гістарычных і археалагічных даследаванняў праблем паходжання гарадоў на беларускіх землях у IX–XIII стст. Вызначаецца ўклад беларускіх гісторыкаў у даследаванне праблем станаўлення гарадоў Беларусі. На падставе гістарыяграфічнага разгляду поглядаў і канцэпцый паходжання гарадоў прааналізаваны канцэптуальныя палажэнні Э. М. Загарульскага, Г. В. Штыхава, В. М. Ляўко. Падкрэсліваецца значэнне нацыянальнай гістарыяграфіі ў даследаванні праблем паходжання гарадоў на беларускіх землях.

*Ключавыя словы:* гістарыяграфія, паходжанне гарадоў на беларускіх землях, крытэрыі горада, трансфармацыя горада, папярэднік горада, археалогія.

The theoretical and conceptual basis of historical and archaeological research to the problems of cities origin in the Belarusian lands in the IX–XIII centuries is considered. The contribution of Belarusian historians to studying the problems of occurrence of Belarusian cities is determined. On the basis of historiographical analysis of the concepts and theories of the origin of cities, the conceptual positions of E. Zagorulski, G. Shtyhov, O. Levko are analyzed. The importance of Belarus's national historiography in the study of the problems of the origin of cities in Belarus is emphasized.

*Keywords:* historiography, the origin of cities in the Belarusian lands, the criteria of the city, transformation of the city predecessor city, archeology.

З пастаноўкай праблем станаўлення раннесярэднявечных гарадскіх цэнтраў звязаны палажэнні А. А. Макушнікава, Д. У. Дука, В. І. Кошмана, у якіх вызначаны асобныя аспекты паходжання гарадоў на тэрыторыі Беларусі. Генезіс гарадоў асобных рэгіёнаў Беларусі прадстаўлены ў працах П. Ф. Лысенка, Я. Г. Звяругі, С. А. Півварчыка, А. А. Мяцельскага. З навуковым абгрунтаваннем тэарэтычных праблем паходжання гарадоў на ўсёй тэрыторыі Беларусі можна звязаць даследаванні Э. М. Загарульскага [1], Г. В. Штыхава [2–7], В. М. Ляўко [8–11]. Мэта дадзенага артыкула – гістарыяграфічны аналіз поглядаў Э. М. Загарульскага, Г. В. Штыхава, В. М. Ляўко аб паходжанні гарадоў на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

Даследаванне тэарэтычных праблем паходжання гарадоў на тэрыторыі Беларусі ў айчыннай гістарыяграфіі распачаў Э. М. Загарульскі. Асноўны свой погляд да праблемы ўзнікнення гарадоў Беларусі Э. М. Загарульскі выклаў у працы «Заходняя Русь: IX–XIII стст.». Ідэйным акцэнтам навукоўцы ў вырашэнні праблемы паходжання і далейшага развіцця гарадоў стаў яго тэзіс, які патрабуе першараднай увагі. Так, Э. М. Загарульскі зазначае: «Рэальнасць патрабуе ад нас дапусціць магчымасць перарастання ў горад паселішча іншага тыпу ў выніку колькаснага накаплення ў ім рамесніцка-гандлёвага элемента, што на нейкім этапе змяніў агульную якасную характарыстыку першапачатковага паселішча, зрабіў яго горадам у навуковым сэнсе гэтага слова» [1, с. 150]. Не адмаўляючы ролі рамяства і гандлю ў станаўленні гарадоў, можна пагадзіцца з дадзеным сцвярджэннем. Для далейшай абгрунтаванасці сваёй тэорыі Э. М. Загарульскі вылучае спецыяльныя прыкметы, якія дакладней дапамагаюць разумець сапраўднасць характару гарадскога паселішча. Да іх ён аднёс: 1) сведчанні існавання мясцовага рамяства і развітога гандлю; 2) «гарадскі» характар бытавых знаходак; 3) дастаткова вялікую плошчу ўмацаванай часткі

Рэпазіторый БДПУ

паселішча; 4) магутнасць абарончых збудаванняў; 5) складаны ўнутрыгарадскі план з элементамі ўпарадкаванасці; 6) наяўнасць неўмацаванага пасада; 7) мануметальныя свецкія ці культавыя будынкі [1, с. 155]. На першым месцы ў сукупнасці прыведзеных прыкмет стаіць «рамесніцка-гандлёвы элемент», што дае нам падставу сцвярджаць аб дамінацыі ў гэтым падыходзе сацыяльна-эканамічнага фактару ў станаўленні гарадоў.

Стаўленне навукоўцы да выключнай ролі рамяства і гандлю як важнай магчымасці «да перараджэння паселішчаў у сапраўдны горад» [1, с. 171] не выключае і другіх асноватворных фактараў. Па меркаванні аўтара, большасць беларускіх гарадоў прайшло праз феадальны (дзяржаўны) шлях утварэння. Э. М. Загарульскі сцвярджае, што ў аснове большасці гарадоў ляжалі такія феадальныя паселішчы, як крэпасць-замак, ваенна-адміністрацыйны і фінансава-адміністрацыйны цэнтр акругі, феадальная сядзіба. Праблему ўзаемаўплыву гандлёва-рамеснага і дзяржаўнага шляхоў узнікнення гарадоў навуковец вырашае наступным чынам: «Яны (вышэй названыя феадальныя паселішчы) валодалі шэрагам пераваг, якія спрыялі назапашванню ў некаторых з іх рамесніцка-гандлёвага элементу» [1, с. 171]. Сцвярджэнні аўтара закранаюць такія праблемы, як папярэднікі гарадоў, іх тыпалогія, магчымасці далейшага пераўтварэння ў гарады. «Такія цэнтры княжацкай адміністрацыі з прычыны мноства спрыяльных абставін, якія выцякаюць з іх стану і тых выгад, якія гэты стан дае, маглі развівацца ў гарады» [1, с. 163]. Да цэнтраў адміністрацыйнай улады навуковец адносіць феадальныя і княжацкія замкі або пагранічныя крэпасці, якія, на яго погляд, складалі аснову будучых гарадоў. Па суджэнні аўтара, менавіта замак забяспечваў развіццё рамяства і гандлю і быў надзейным прытулкам для рамеснікаў і гандляроў. У агульным і цэлым на падставе разважанняў Э. М. Загарульскага магчыма вызначыць канцэпт аўтара – гораду як цэнтру рамяства і гандлю папярэднічалі ваенна-адміністрацыйныя цэнтры.

Падсумаванне сваіх поглядаў аўтар завяршае фарміраваннем агульных сацыяльных схем. Асноватворнай субстанцыяй, па Э. М. Загарульскаму, у дадзеным працэсе выступае паселішча, якое спачатку абмежавана крэпасцю, а потым выходзіць за яго межы і ўтварае пасад.

Як нам уяўляецца, вызначэнне першаасновы гарадоў павінна суправаджацца і вызначэннем сацыяльнай сутнасці папярэднікаў. Акцэнтуючы ўвагу на прывязцы ўтваральных працэсаў гарадоў да крэпасці, Э. М. Загарульскі ў недастатковай меры паказвае ступень адпаведнасці яе сацыяльнага прызначэння і функцыянальнай прыроды фарміравальным працэсам утвараемых гарадскіх цэнтраў. Высвятленне дадзенай праблемы павінна таксама ўлічваць рэгіянальную спецыфіку паходжання гарадоў. Правільнае суаднясенне сацыяльнай прыроды гарадскога папярэдніка з фактарамі ўтварэння гарадоў дазволіць больш дакладна асэнсаваць адрозныя магчымасці і шляхі паходжання беларускіх гарадоў.

Значны ўклад у распрацоўку праблем паходжання і станаўлення беларускіх гарадоў унёс Г. В. Штыхаў. Пачынаючы з даследавання праблем узнікнення гарадоў асобнага рэгіёна, аўтар выйшаў на больш высокі ўзровень, які звязаны з асэнсаваннем вытокаў гарадоў на ўсіх беларускіх землях. Праблема паходжання і станаўлення гарадоў, якая пастаўлена навукоўцам у абагульненым даследаванні «Города Полоцкой земли (IX–XIII вв.)» і спецыяльных навуковых артыкулах, арганічна ўключае і спалучае дасягненні археалагічнай навукі і асабісты аўтарскі падыход. У аснову тэарэтыка-метадалагічнай сістэмы поглядаў Г. В. Штыхава пакладзены фармацыйна-цывілізацыйны падыход, які дазволіў аўтару разгледзець раннесярэдявечны горад не толькі як цэнтр рамяства і гандлю, аднак і як асяродак, што засяроджваў у сабе культурныя дасягненні грамадства.

Даследаванне праблемы навуковец пачынае з фармуліроўкі агульнагістарычных схем перадумоў узнікнення гарадоў. Стрыжнёвай асновай аўтарскай ідэі Г. В. Штыхава стала яго палажэнне, якое патрабуе першачарговай навуковай ацэнкі. Так, аўтар зазначаў, што «происхождение городов Полоцкой земли может быть представлено следующим образом. Предвестниками древнейших из них были укрепленные пункты славян, возникшие при их расселении на территории Подвинья в IX в… Постепенно укрепленный населенный пункт, обрастая посадскими поселениями, становился центром ремесла и торговли в связи с необходимостью переработки и реализации феодальной ренты…» [2, с. 14]. Дадзенае суджэнне заслугоўвае прызнання, па-першае, за тое, што аўтар вызначыў ступень пераемнасці паміж умацаваным племянным цэнтрам

Рэпазіторый БДПУ

(пунктам) і гандлёва-рамесным пасяленнем і, па-другое, за разуменне навукоўцам прыроды ўзаемаабумоўленасці асноватворных шляхоў паходжання гарадоў.

Падкрэсліваючы сацыяльна-эканамічны фактар у развіцці генезісных форм утвараемых цэнтраў, даследчык надае значэнне і палітыка-адміністрацыйнай першаснове ў складванні горада. Па яго меркаванні, з развіццём гандлю і рамёстваў, абрастаючы пасадамі, паселішчы пераўтвараліся ў гарады [3, с. 228]. Пастаноўка праблемы горадаўтварэння прадугледжвала Г. В. Штыхавым і вылучэнне тыпаў паселішчаў, на аснове якіх складваліся гарады.

Відавочнае месца ў сістэме поглядаў Г. В. Штыхава на раду з тыпамі паселішчаў займае праблема прагорада[1] [4; 5]. Істотным адрозненнем прагорада ён лічыць рамесна-гандлёвую абмежаванасць. Як нам падаецца, узнікненне горада на аснове прагорада ўяўляецца бесперспектыўным без уздзеяння неабходных фактараў. Для пераўтварэння прагорада ў раннегарадскі арганізм неабходна як мінімум выкарыстанне ім зручнага месцазнаходжання (геаграфічны фактар) і пашырэнне ўмацаванай часткі гарадзішча (ваенна-абарончы фактар).

На падставе поглядаў Г. В. Штыхава можна вызначыць асноватворную ідэю аўтара: у развіцці генезісных форм (умацаваных паселішчаў, абарончых умацаваных пунктаў, феадальных замкаў, прагарадоў) гарадоў галоўнай умовай выступае геаграфічны (выгаднае размяшчэнне) і сацыяльна-эканамічны фактар (развіццё рамяства і гандлю), якія садзейнічаюць пераўтварэнню паселішча адміністрацыйна-гаспадарчага, ваенна-адміністрацыйнага кшталту ў горад.

Катэгарызацыя горада, які адрозніваецца ад іншых населеных пунктаў, можа быць заснавана на крытэрыях, якія прапанаваў Г. В. Штыхаў у сваіх даследаваннях [5–7]. Да асноўных (сацыяльна-гістарычных), якія неабходна лічыць абавязковымі, навукоўца адносіў: 1) выкананне населеным пунктам ролі цэнтра феадальнай улады; 2) наяўнасць дзяцінца і пасада; 3) пражыванне значнай часткі гандлёва-рамеснага насельніцтва; 4) існаванне гарадской абшчыны. Дадатковую групу крытэрыяў Г. В. Штыхава ўтвараюць археалагічна-архітэктурныя прыкметы: канцэнтрацыя жылых і вытворчых збудаванняў, манументальна-культавыя збудаванні, другая лінія ўмацаванняў, устойлівая тэндэнцыя росту плошчы дзяцінца і пасада, распалажэнне пасада па абодвух берагах ракі, спецыфічны культурны слой. Заслугай Г. В. Штыхава з’яўляецца ўвядзенне ім дадатковых крытэрыяў для асобных гарадоў Паўночнай і Цэнтральнай Беларусі [5, с. 155; 156].

Лагічным завяршэннем навуковых пабудоў Г. В. Штыхава стала раскрыццё ўнутранай прыроды горада IX–XIII стст.: «*Город… в отличие от деревни является постепенно усложняющимся при своем развитии социальным организмом с присущими ему разнообразными функциями – торгово-ремесленными, военно-оборонительными, административными, культурными, религиозными*» [2, с. 18]. Разуменне горада як арганізма, які паступова ўскладняецца ў сваім развіцці, стала вядучым канцэптам у сістэме поглядаў навукоўцы і прадвызначыла выкарыстанне ім падыходу, які заснаваны на эвалюцыйна-паступальным развіцці гарадоў (прагорад-горад) з характэрнымі для іх асаблівасцямі і адметнымі (лакальнымі) рысамі на рэгіянальным узроўні [5, с. 155].

Ацэньваючы навуковыя пазіцыі Г. В. Штыхава, трэба зазначыць, што ў аснове поглядаў даследчыка знаходзіцца сінкрэтычная метадалогія, якая адрознівае яго ад іншых навукоўцаў. Для светаўспрымання аўтара не стала характэрнай абсалютызацыя адзінай варыятыўнай тэорыі паходжання гарадоў. Падобных пазіцый прытрымліваецца і Э. М. Загарульскі, які выявіў узаемаабумоўленасць шляхоў паходжання гарадоў на аснове падпарадкавання яе асноўнай ідэі замкавай тэорыі (сацыяльна-палітычнаму фактару).

Логіка навуковых разважанняў В. М. Ляўко ў завершаным выглядзе ўтварае сістэму поглядаў, якая адлюстроўвае аўтарскія навацыі ў раскрыцці праблем паходжання гарадоў на тэрыторыі Беларусі. Уласны погляд да праблемы паходжання гарадоў на беларускіх землях В. М. Ляўко выклала ў манаграфічным даследаванні «Средневековые территориально-административные центры Северо-Восточной Беларуси» [8] і спецыяльных навуковых артыкулах [9; 10]. Асноўныя дасягненні гістарычнай навукі і асабістыя меркаванні да праблемы складвання гарадскіх цэнтраў на Беларусі прыве-

[1] Прагорад – пасяленне пераходнага тыпу: пасёлак першабытнаабшчынага часу, які пры наяўнасці адпаведных умоў у далейшым сваім развіцці мог стаць горадам у сацыяльна-эканамічным разуменні.

Репозиторий БГПУ

дзены даследчыкам у 1-м томе шасцітомнай «Гісторыі Беларусі». Адпраўным тэзісам, якім кіруецца навуковец, стала сцвярджэнне: «Фарміраванне дзяржаўнасці і зараджэнне сярэднявечных гарадоў – з'явы адначасовыя і ўзаемаабумоленыя ў сваіх генезісных формах» [11, с. 250]. Знаходзячыся пад уплывам поглядаў П. П. Талочкі, В. М. Ляўко, тым не менш выявіла спецыфіку трансфармацыйнага станаўлення гарадоў на беларускіх землях.

Разуменне гандлёва-рамеснага працэсу горадаўтварэння В. М. Ляўко зводзіць да ўдалага размяшчэння паселішчаў на гандлёвых шляхах трансеўрапейскай супольнасці [11, с. 250]. Аб ступені важнасці гандлёва-рачных камунікацый у станаўленні ранніх гарадоў Полацкай зямлі зазначалі яшчэ Л. В. Аляксееў і Г. В. Штыхаў. Пры гэтым, не адмаўляючы ролі гандлёвых стасункаў у найбольш раннім узнікненні Полацка як племяннога цэнтра, В. М. Ляўко ўводзіць ідэю аб бесперспектыўнасці дадзенага шляху ўтварэння гарадоў на тэрыторыі Беларусі для адкрытых гандлёва-рамесных паселішчаў[1]. Болей таго, даследчык падкрэслівае, што гандлёва-рамесную сферу нельга лічыць першай стадыяй трансфармацыі гарадскіх форм жыцця [11, с. 251]. Дадзеныя падсумаванні навукоўца нельга лічыць у поўнай ступені пераканаўчымі, паколькі для пацвярджэння іх доказнасці В. М. Ляўко ўказала толькі на факт недоўгачасовага існавання адкрытых гандлёва-рамесных паселішчаў, якія па сваіх знешніх прыкметах выступаюць як прагарады. Вызначэнне шляху станаўлення, які бы адпавядаў першай стадыі трансфармацыі генезісных форм гарадоў, быў паказаны даследчыкам наступным чынам: «В ходе развития выделившихся функций и под воздействием внешних факторов, например образования государственных структур, происходит трансформация… поселений в протогорода» [9, с. 39]. Зыходзячы з ацэнкі дадзенага суджэння, магчыма заўважыць, што даследчык ускосна прызнае за дзяржаўным фактарам утварэння гарадоў першую стадыю горадаўтварэння. Болей таго, В. М. Ляўко зазначала, што «в становлении раннесредневековых городов значительная роль принадлежит государственной власти» [9, с. 39]. Падкрэсліваючы значэнне дзяржаўнага фактару ў фарміраванні гарадоў, трэба мець на ўвазе, што станаўленне дзяржаўнасці і ўтварэнне гарадоў – узаемаабумоўлены працэс. Вытокі дадзенай узаемаабумоўленасці не сталі прадметам самастойнага даследавання ў гістарычнай навуцы. Параўноваючы генезіс гарадоў і дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі, становіцца відавочным, што іх утварэнню папярэднічалі не толькі тэрытарыяльна-адміністрацыйныя першаасновы, але і сацыяльна-эканамічныя. Пры вызначэнні сутнасці першай стадыі (пратагарадской) трансфармацыі гарадскіх форм жыцця абапірацца на адзіны шлях утварэння гарадоў метадалагічна не верна.

Надаючы дзяржаўнаму фактару першаснае значэнне ў працэсе горадаўтварэння, В. М. Ляўко звяла ролю сацыяльна-эканамічнага да другараднага: «Галоўным стрыжнем росту і развіцця гарадоў была крэпасць… насельніцтва акругі… цягнулася пад яе сцены. Гэта спрыяла… пераарыентацыі часткі насельніцтва акругі з сельскагаспадарчай на рамесную вытворчасць» [11, с. 255].

Звяртаючыся да праблем трансфармацыі генезісных форм гарадоў у пабудовах В. М. Ляўко, неабходна надаць увагу слушнай думцы аўтара аб тым, што «на протогородском этапе развития одни поселения приобретают новые функции свойственные городам, другие становятся погостами…» [9, с. 39]. В. М. Ляўко аб'ектыўна зазначыла, што протагорад выступае магчымым варыянтам завяршаючай стадыі фарміравання гарадскіх форм жыцця. Разам з тым, у айчыннай навуцы пераважным стала праводзіць атаясамліванне паміж дэфініцыямі прагорад і протагорад як аднасэнсоўнымі найменнямі. Пры гэтым адназначнай інтэрпрэтацыі папярэднікаў горада не існуе. Мы прытрымліваемся пазіцыі размежавання дадзеных паняццяў.

Звяртаючыся да праблемы гарадскіх прыкмет, В. М. Ляўко падкрэслівае ўскосны характар такога крытэрыю, як наяўнасць гарадскога пасада. Разам з тым, даследчык звяртае ўвагу і на тое, што ў гістарычнай навуцы сталі выкарыстоўвацца і такія прыкметы, як наяўнасць двароў знаці, цэркваў, слядоў адміністратыўнага кіравання [9, с. 10]. На погляд аўтара, аналіз ваенна-палітычнага, гаспадарча-эканамічнага развіцця рэгіёну, у якім знаходзяцца ўмацаваныя пасяленні, з'яўляецца важным фактарам вы-

[1] Адкрытыя гандлёва-рамесныя паселішчы – паселішчы, у склад якіх уваходзілі невялікае гарадзішча, вялікае неўмацаванае паселішча з курганным могільнікам, якія размяшчаліся на галоўных водных магістралях.

Рэпазіторый БДПУ

значэння іх сацыяльнай сутнасці [9, с. 75]. З дадзенай пастаноўкай праблемы неабходна пагадзіцца, паколькі сацыяльная сутнасць пасялення павінна вызначацца яго функцыянальным прызначэннем і тым месцам, якое яно займае ў сістэме ўзаемазвязаных рэгіянальных аб'яднанняў.

Ацэньваючы погляды В. М. Ляўко, трэба зазначыць, што аўтар у сваёй даследчай дзейнасці значную ўвагу надае асэнсаванню працэсаў зараджэння тэрытарыяльна-адміністрацыйных інстытутаў дзяржаўнасці на беларускіх землях, дэталёваму вывучэнню асобных рэгіёнаў і выяўленню ўнутры іх з'яўлення сацыяльных арганізмаў гарадскога тыпу, якія ўзаемазвязаны паміж сабой [8]. Вырашэнне праблемы паходжання гарадоў на тэрыторыі Беларусі праз ролю дзяржаўнага (тэрытарыяльна-адміністрацыйнага) фактару робіць погляды В. М. Ляўко адрознымі ад айчынных і расійскіх даследчыкаў. Тым самым В. М. Ляўко ўнесла ў гістарычную навуку Беларусі новае разуменне перадумоў узнікнення дзяржаўнасці і гарадоў на беларускіх землях. У свеце агульнатэарэтычных і канкрэтна-гістарычных уяўленняў погляды В. М. Ляўко арганічна адлюстроўваюць дасягненні сучаснай гістарычнай навукі і навуковы патэнцыял беларускай археалогіі.

Гістарыяграфічны аналіз поглядаў айчынных навукоўцаў дазваляе зрабіць высновы, якія ўдакладняюць і пашыраюць тэарэтычныя палажэнні. 1. Праблема фактарнай узаемаабумоўленасці (сацыяльна-эканамічны – сацыяльна-палітычны фактар) станаўлення носьбітаў гарадскіх арганізмаў ускрыта ў поглядах Э. М. Загарульскага, Г. В. Штыхава. 2. Прыярытэт дамінацыі вырашальнага фактару горадаўтварэння дазваляе адрозніваць светапоглядную сістэму В. М. Ляўко ад іншых палажэнняў навукоўцаў. 3. Суіснаванне розных поглядаў ускладняе працэс канструявання адзінай метадалагічнай асновы ўзнікнення горада і выклікае неабходнасць асэнсавання заканамернасцяў градаўтварэння праз адзіную субстанцыйную прыроду, якая засяроджвае ў сабе тыпавую разнастайнасць гарадскіх папярэднікаў у іх кансалідуючай і фактарна дэтэрмінаванай аснове.


### Літаратура

1. *Загарульскі, Э. М.* Заходняя Русь: IX–XIII стст. / Э. М. Загарульскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 239 с.
2. *Штыхов, Г. В.* Города Полоцкой земли (IX–XIII вв.) / Г. В. Штыхов. – Минск : Наука и техника, 1978. – 160 с.
3. Археалогія Беларусі : у 4 т. / рэдкал.: М. В. Біч (старш.) [і інш]. – Мінск : Беларус. навука, 1997–2001. – Т. 3: Сярэдневяковы перыяд (IX–XIII стст.) / Я. Г. Звяруга [і інш.]. – 2000. – 554 с.
4. *Штыхов, Г. В.* Средневековые города Беларуси и их предшественники (к проблеме восточнославянского протогорода) / Г. В. Штыхов // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. – 2008. – № 1. – С. 2–6.
5. *Штыхов, Г. В.* Проблемы генезиса городов Полоцкой земли / Г. В. Штыхов // Древнерусский город : материалы Всесоюз. археолог. конф. посвящ. 1500-летию г. Киева (март 1928 г.). – Киев, 1984. – С. 154–156.
6. *Штыхов, Г. В.* Критерии города эпохи Киевской Руси (по материалам исследований городов Полоцкой земли IX–XIII вв.) / Г. В. Штыхов // Тезисы докладов советской делегации на V Международном конгрессе славянской археологии. – М., 1985. – С. 76–77.
7. *Штыхов, Г. В.* Критерии города эпохи Киевской Руси: (По материалам Полоцкой земли) / Г. В. Штыхов // Тр. V Междунар. конгр. славянской археологии, Киев, 18–25 сент. 1985 г. – Москва. – 1987. – Т. 1. вып. 2 б, секция 2. – С. 148–154.
8. *Левко, О. Н.* Средневековые территориально-административные центры Северо-Восточной Беларуси: Формирование и развитие / О. Н. Левко. – Минск : Беларус. навука, 2004. – 278 с.

### References

1. *Zagarulski, E. M.* Zakhodnyaya Rus: IX–XIII stst. / E. M. Zagarulski. – Minsk: Universitetskaye, 1998. – 239 s.
2. *Shtykhov, G. V.* Goroda Polotskoy zemli (IX–XIII vv.) / G. V. Shtykhov. – Minsk: Nauka i tekhnika, 1978. – 160 s.
3. Arkhealogiya Belarusi : u 4 t. / redkal.: M. V. Bich (starsh.) [i insh]. – Minsk: Belarus. navuka, 1997–2001. – T. 3: Syarednevyakovy peryyad (IX–XIII stst.) / Ya. G. Zvyaruga [i insh.]. – 2000. – 554 s.
4. *Shtykhov, G. V.* Srednevekovyye goroda Belarusi i ikh predshestvenniki (k probleme vostochnoslavyanskogo protogoroda) / G. V. Shtykhov // Vestnik Polotskogo gosudarstvennogo universiteta. Seriya A. Gumanitarnyye nauki. – 2008. – № 1. – S. 2–6.
5. *Shtykhov, G. V.* Problemy genezisa gorodov Polotskoy zemli / G. V. Shtykhov // Drevnerusskiy gorod: materialy Vsesoyuz. arkheolog. konf. posvyashch. 1500–letiyu g. Kiyeva (mart 1928 g.). – Kiyev, 1984. – S. 154–156.
6. *Shtykhov, G. V.* Kriterii goroda epokhi Kiyevskoy Rusi (po materialam issledovaniy gorodov Polotskoy zemli IX–XIII vv.) / G. V. Shtykhov // Tezisy dokladov sovetskoy sluzhby na V Mezhdunarodnom kongresse slavyanskoy arkheologii. – M., 1985. – S. 76–77.
7. *Shtykhov, G. V.* Kriterii goroda epokhi Kiyevskoy Rusi: (Po materialam Polotskoy zemli) / G. V. Shtykhov // Tr. V Mezhdunar. kongr. slavyanskoy arkheologii, Kiyev, 18–25 sent. 1985 g. – Moskva. – 1987. – T. 1. vyp. 2 b, sektsiya 2. – S. 148–154.
8. *Levko, O. N.* Srednevekovyye territorialno-administrativnyye tsentry Severo-Vostochnoy Belarusi: Formirovaniye i razvitiye / O. N. Levko. – Minsk : Belarus. navuka, 2004. – 278 s.


Репозиторий БНТУ

9. *Левко, О. Н.* Возникновение и развитие раннесредневековых городов на севере-востоке Белоруссии / О. Н. Левко // Усебеларуская канферэнцыя гісторыкаў: Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя канцэпцыі і падыходы) : у 2 ч. Ч. 2. Мінск, 3–5 лютага 1993 г., Мінск, 1994. – С. 38–44.
10. *Левко, О. Н.* Древнейшие города Полоцкой земли у истоков истории древнерусского государства / О. Н. Левко // Стародавній Іскоростень і слов'янські граді : зб. навук. прац. Коростень, 2008. – Т. 2. – С. 9–13.
11. *Ляўко, В.* Гарады / В. Ляўко // Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 1: Старажытная Беларусь. Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. – Мінск, 2000. – С. 249–256.

9. *Levko, O. N.* Vozniknoveniye i razvitiye rannesrednevekovykh gorodov na severo–vostoke Belorussii / O. N. Levko // Usebelaruskaya kanferentsyya gistorykau: Gistarychnaya navuka i gistarychnaya adukatsyya u Respublitsy Belarus (novyya kantseptsyi i padykhody): u 2 ch. Ch. 2. Minsk, 3–5 lyutaga 1993 g., Minsk, 1994. – S. 38–44.
10. *Levko, O. N.* Drevneyshiye goroda Polotskoy zemli u istokov istorii drevnerusskogo gosudarstva / O. N. Levko // Starodavniy Iskorosten i slovyanski gradi: zb. navuk. prats. Korosten, 2008. – T. 2. – S. 9–13.
11. *Lyauko, V.* Garady / V. Lyauko // Gistoryya Belarusi: u 6 t. T. 1: Starazhytnaya Belarus. Ad pershapachatkovaga zasyalennya da syaredziny XIII st. – Minsk, 2000. – S. 249–256.


Репозиторий БГПУ